# Вечарына памяці





❑ Павел Знавец спявае песні Новіка-Пеюна.



❑ Выступае Сяргей Грахоўскі.

❑ Апошні здымак, зроблены пры жыцці Сяргея Новіка-Пеюна.

Надзіва цёплай і душэўнай атрымалася вечарына "Хай Беларусь мне вечна сніцца", прысвечаная памяці Сяргея Новіка-Пеюна. Сюды, у невялікую залу Нацыянальнай бібліятэкі сталіцы прыйшлі родныя, блізкія сябры, знаёмыя Сяргея Міхайлавіча і ўсе, хто любіў, паважаў гэтага незвычайнага чалавека, хто цаніў яго талент. Лёс і сапраўды яму не ўсміхаўся, а адпусціў столькі цяжкіх выпрабаванняў, што іх хапіла б на добры дзесятак, а мо і сотню звычайных чалавечых жыццяў.

На яго долю выпала лепшыя гады жыцця змарнаваць у турэмных засценках польскіх пілсудчыкаў, фашысцкіх гестапаўцаў. Хапіла яму і ад сталінскага рэжыму. "Народны пакутнік", — так сказаў пра яго Сяргей Грахоўскі, ўспамінаючы лёс і біяграфію Новіка-Пеюна.

Гэта быў надзвычай душэўна багаты, інтэлігентны, высокай культуры, духоўнасці і маралі чалавек. Яго ўзнёслы талент мастака, паэта і літаратара, увогуле даравітага чалавека мог бы столькі паслужыць так горача любімай ім Беларусі, каб лёс быў трошкі літасцівым да яго. Але і тое, што стварыў Новік-Пяюн — вершы песень "Зорачка", "Над Шчарай" і іншыя — дае падставы берагчы доўгую, светлую памяць пра Сяргея Міхайлавіча Новіка-Пеюна, шчырага беларуса, патрыёта.

Цёплымі словамі ўспамінаў падзяліліся вядомыя беларускія дзеячы Сяргей Грахоўскі, Ларыса Рублеўская, Галіна Дзягілева з дачкою, Галіна Смоляк, Яраслаў Пархута і многія іншыя. Гучалі цудоўныя вершы Новіка-Пеюна, песні на яго вершы і прысвечаныя яму.

Марыя ЖЫЛІНСКАЯ.

Фота аўтара і Уладзіміра КАРМІЛКІНА.